# СВЯТЫ АБАВЯЗАК — ЗАХАВАЦЬ ПРАЎДУ

**Учора з самага ранку на станцыі Мінск-Пасажырскі было надзвычай шматлюдна. І гэта не звязана з пачаткам лета і дачным сезонам. На вакзале сустракалі незвычайны састаў... На перон прыбыў «Цягнік Перамогі».**

Гэта інтэрактыўная экспазіцыя, якая пераносіць наведвальнікаў у падзеі Вялікай Айчыннай вайны. У дзевяці вагонах (а ўсяго іх 12) расказваецца аб подзвігу абаронцаў Брэсцкай крэпасці, аб жыцці ў акупацыі, транслюруецца гераічная барацьба на франтах, у падполлі і партызанскіх зонах, доўгачаканая Перамога!



Фота БелТА.

— Наш святы абавязак — захаваць гістарычную праўду, памяць аб Перамозе над нацызмам і перадаць яе будучым пакаленням, — адзначыў **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар ЛУЦКІ.** — Супраць Беларусі і Расіі ідуць інфармацыйныя войны і атакі, якія не спыняюцца. Нашым людзям, асабліва моладзі, спрабуюць навязаць наскрозь фальшывыя гістарычныя наратывы, калі Савецкі Саюз нароўні з фашысцкай Германіяй абвінавачваюць у развязванні Другой сусветнай вайны, калі савецкія сімвалы прыраўноўваюцца да нацысцкіх, а людзям забараняюць святое для іх свята пад сцягам Вялікай Перамогі. Яны хочуць, каб мы, нашчадкі герояў-пераможцаў, апраўдваліся за сваіх дзедаў і прадзедаў, якія цаной уласнага жыцця выратавалі жыццё ўсяму чалавецтву. Мы прынялі гэты выклік, мы адстаім праўду, адстаім наша права на памяць аб подзвігу, наша права на суверэннае развіццё сёння і ў будучыні.

Над гісторыка-асветніцкім праектам «Цягнік Перамогі» працавала вялікая каманда прафесіяналаў. Менавіта дзякуючы іх намаганням, трапіўшы ў цягнік, быццам сам з'яўляешся калі не ўдзельнікам, то сведкай тых гераічных, а разам з тым трагічных падзей. У цягніку можна не толькі дакрануцца да прадметаў, але і пачуць аўдыяаповед. Медыяэкраны, трохмерныя панарамы, поўнамаштабныя фігуры герояў, незвычайныя лакацыі, спецэфекты, датчыкі прысутнасці, панарамы баёў віртуальнай рэальнасці — сучасныя тэхналогіі дазваляюць пазнаёміцца з многімі эпізодамі Вялікай Айчыннай вайны.

Састаў пройдзе па многіх рэгіёнах нашай краіны. 80-ю гадавіну пачатку Вялікай Айчыннай вайны сустрэне ў Брэсцкай крэпасці-героі, якая адной з першых прыняла ўдар гітлераўцаў. Завяршыцца маршрут 27—28 чэрвеня ў Магілёве — у дзень вызвалення горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.